УДК 821.161.3.09-14

# НАТУРФІЛАСОФСКАЯ СТЫХІЯ АГНЮ Ў ЛІРЫЦЫ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

**Г.М. Мятліцкая**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
пр-т Незалежнасці, 4, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь

**Аннотация.** Анализируется специфика художественного осмысления стихии огня в лирике Евгении Янищиц.

***Ключевые слова:*** лирика; природа; натурфилософия; семантика; стихия; огонь; любовь.

# NATURAL-PHILOSOPHICAL ELEMENT OF FIRE IN THE LYRICS OF YEVGENIYA YANISHCHITS

**H.M. Miatlitskaya**
Belarusian State University
Independence Avenue 4, 220004, Minsk, Republic of Belarus

**Annotation.** The article contains an analysis of the specifics of the artistic understanding of the element of fire in the lyrics of Yevgeniya Yanishchits.

**Keywords:** lyrics; nature; natural philosophy; semantics; element; fire; love.

Творчасць беларускай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц з’яўляецца адной з самых яркіх і адметных старонак у беларускай жаночай лірыцы 1970 – 1980-х гадоў. Ды, па сутнасці, такой застаецца і да сённяшняга часу. Маладая таленавітая аўтарка хутка набыла прыхільнасць і папулярнасць у чытачоў. Выступала на шматлікіх мерапрыемствах, чытаючы свае творы, раздавала аўтографы, умела прыгожа спяваць, ды і ўвогуле жыла паэзіяй… Не губляючы сувязь з роднай вёскай і вяскоўцамі, пры гэтым жывучы ў горадзе, паэтэса “рэдка абыходзіцца без пейзажу, без пейзажна-песеннай алегорыі” [1, с. 324]. На думку некаторых даследчыкаў, гэта можна растлумачыць найперш тым, што ў яе былі “незвычайныя здольнасці ўнутранага напаўнення, назапашвання сіл, вопыту ад навакольнага свету” [2, с. 39]. Таму і лірычная гераіня Я. Янішчыц жыве ў гармоніі з прыродай, разумее і любіць усе яе праявы. Прырода спрыяе напісанню твораў праўдзівых і простых, аберагае “ад позы лішняе і слоў” [3, с. 33]. Яна з’яўляецца галоўнай крыніцай паэтычнага натхнення, таму што “спеўна дыхае” няхітрымі песнямі,

прымаўкамі [4, с. 36], вучыць мудрасці і дапамагае перажываць жыццёвыя нягоды. Усе з’явы прыроды звычайна адухаўляюцца ў творчасці Я. Янішчыц. Паэтэса “адчувае вечнае // У мове нематы” [5, с. 57], ведае закон гармоніі, адвечнай суладнасці паміж чалавекам і прыродай (“Сілай адной знітаваны навечна // Прашчуры і мурашы” [6, с. 74]), заклікае людзей да разумнага, правільнага жыцця.

“Прырода – надзвычай складана арганізаваная сістэма, якая здольна да пастаяннага самаўдасканалення, да невычарпальных магчымасцей развіцця” [7, с. 140], – адзначыла даследчыца Т. Шамякіна. А чалавек – часцінка Сусвету, мікракосмас, які, як і макракосмас, аб’ядноўвае ў сабе чатыры элементы: Агонь (розум), Паветра (пачуцці), Ваду (жыццёвую энергію) і Зямлю (цела). Галоўны закон чалавечага жыцця – самаўдасканаленне ў гармоніі з прыродай.

Сярод чатырох натурфіласофскіх стыхій агонь – самы загадкавы і невытлумачальны, сімвалізуе абнаўленне праз знішчэнне, што сведчыць пра яго амбівалентнасць. Паводле Т. Шамякінай, агонь удзельнічае ў будове свету і кіруе светам, увесь час яго стварае, таму што жыццё людзей і прыроды цалкам залежыць ад сонца, якое дорыць святло і цяпло. Нашы продкі добра разумелі гэта, шанавалі агонь, лічылі яго свяшчэнным. У лясах размяшчаліся свяцілішчы нязгаснага агню, які называўся Зніч. Ён выкарыстоўваўся ва ўсіх рытуальных ачышчэннях [8].

Славяне-арыі верылі, што ўсе добрыя справы звязаны з агнём. І сапраўды, агонь далучае да ісціны, прымушае задумвацца над вечнымі пытаннямі, развівае фантазію і ўяўленне. Варта таксама адзначыць, што і зыходнае значэнне слова *агонь* пераважна станоўчае, яно суадносіцца са значэннямі “рэзаць” (літаральна: “выкрасаць агонь”), “браць, узяць” (“ахапіць полымем”), “светлы, бліскучы”, “чысты”, “куча дроў”, “уздымацца ўверх”, “вільгаць, вада”, “маёмасць, багацце” [9, с. 141–143].

Самай першай, галоўнай стыхіяй у антычнай філасофіі лічыўся агонь, сімвал цывілізацыі. Стваральнік дыялектыкі Геракліт прызнаваў агонь першавытокам усяго існуючага. Сёння фізікі згаджаюцца, што такі першавыток – плазма.

Выключная роля адводзіцца агню ў Бібліі, які ў Старым Запавеце сімвалізуе магічную Божую сілу. Менавіта праз яго адбываецца кантакт, сувязь паміж Богам і чалавекам (палаючы куст цярноўніка, вогненны слуп...). Увогуле, праваслаўе называе Бога адзіным духоўным сонцам.

Шмат увагі надаецца стыхіі Агню і яе важнай ролі ў светабудове і ў чалавечым арганізме ў “Вучэнні Жывой Этыкі”, выдадзеным Міжнародным Цэнтрам Рэрыхаў. Прывядзём некалькі прыкладаў: агонь выступае як элемент, які мае ўласцівасць “…звязваць, праяўляцца ўсюды, <…> дае

пазнанне найтанчэйшых энергій, <…> напітвае невымерную прастору” [10, с. 424–425]; “з’яўленне (у арыгінале: уявление. – *Г.М.*) Агню ёсць прасвятленне матэрыі; інакш кажучы, дзе Агонь, там прыкмета ўдасканальвання”; “Ямы цемры патрабуюць моцнай дэзынфекцыі. Калі ж вам скажуць пра небяспечнасць стыхіі Агню, адказвайце, што небяспека ёсць вянец подзвігу” [10, с. 425]; “спакой не з’яўляецца ўласцівасцю агню. Агонь заўсёды нешта знішчае, каб тварыць” [10, с. 466]. Чалавек непасрэдна звязаны з агнём: кожнаму “неабходна <…> зразумець вогненнае зерне духу і маўкліва ўстанавіць сувязь агню духа з Прасторавым Агнём” [10, с. 477].

Ва ўсе часы агонь – важнейшы кампанент святаў і абрадаў. Дж. Фрэзер адзначыў, што выкарыстанне агню – гэта, з аднаго боку, “сонечныя чары або магічныя цырымоніі, прызваныя па прынцыпу імітатыўнай магіі забяспечыць неабходны запас сонечнага святла”, а з другога – ачышчэнне, мэта якога “спаліць і знішчыць усялякі шкодны ўплыў, які зыходзіць ад жывых істот і ведзьмаў, дэманаў і монстраў або выступае ў безаблічнай форме – як свайго роду зараза, што распаўсюджваецца ў паветры” [11, с. 670].

Агонь – складаны мастацкі вобраз у творчасці Яўгеніі Янішчыц. І найперш агонь успрымаецца паэтэсай як сімвал светлага, незвычайнага пачуцця – кахання. Да прыкладу:

Душы няшчадна гарэлі,
Полымя – як над лясамі.
Хтосьці купляў імартэлі.
Amo [6, с. 82] (amo (*лац.*) – люблю. – *Г.М.*).

У сэрцы лірычнай гераіні, “у артэрыях гарачых” нават нягледзячы на разлуку з каханым “нервова ўспыхвае агонь” [5, с. 50], гарачы і незгасальны, як Зніч. Прычым утвараецца своеасаблівае адзінства болю і агню [3, с. 46]. “Ах, няўжо агонь // Не дакоціцца // Да таго, / хто па мне // Ды маркоціцца?..” [12, с. 45], – галоўнае пытанне, якое турбуе лірычную гераіню. Яна разумее не толькі незваротнасць, але і небяспечнасць кастра “высокае пары” [4, с. 191], адчувае, “Колькі нервачак дарэмна // Падарыла я агню” [4, с. 215]. Паступова прыходзіць змірэнне: “І нашто былую песню клікаць! // Боль агню растаў у тумане” [4, с. 210], “Чужы агонь вяртаць, // Як над сабой смяяцца” [4, с. 161].

Вясна – час кахання, расквіту ў прыродзе. Паэтэса апісвае з’яўленне першага лісця, заўважае, “як за шашой зялёны плыў пажар”, як “успыхвалі <…> // Зялёныя агеньчыкі бяроз” [6, с. 81]. Зеляніна хутка пажаўцее – гэта заканамерны працэс, а потым зноў прыйдзе вясна:

Вясна, агонь зялёнага азарту,
Люблю твайго размаху крыгаход...
Зялёны сад – ён стане жоўтым заўтра,

Але нальецца тайнай сілай плод!

Аціхне шум. Аціжалее крона.
Ды зноў успыхне лісцік выразны.
І блаславіць нашчадак акрылёна
Кахання сад і ластаўку вясны [6, с. 162].

Успрынящце часу своеасаблівае. У творах дамінуе вясна, якая дорыць радасць, прыгажосць, абнаўленне і прыродзе і чалавеку. А таксама паэтэса любіць “восень задуменную”, таму што “родам з лістападу” [3, с. 54]. Прычым унутраны свет лірычнай гераіні напоўнены “галасамі” ўсіх пор года, якія “Звіняць, гудуць наперабой // І нараджаюцца нанова...”, “Бо і сама я, як прырода, // То ападаю, то цвіту” [5, с. 40].

У вершы “***Ці чуецца ў зманлівым спакоі…”, прысвечаным паэту Юрку Голубу, ёсць такія радкі: “Яшчэ гарыць і іскрамі страляе // Касцёр вясёлы польнага юнацтва...” [4, с. 124]. Тут маецца на ўвазе агонь сяброўства, які ацалеў у душы паэтэсы, вытрымаў крутаверці “расстайнай завірухі” [4, с. 124]. Ды і само юнацтва – час “гарачых кастроў пачуцця”, калі “моц гартавалася ў буры” [4, с. 17].

Эпіграф да верша “Кастры ў Петраградзе” – словы У. Маякоўскага пра Аляксандра Блока, у якіх адлюстроўваецца ўспрыманне гэтымі паэтамі рэвалюцыйных перамен як абнаўлення краіны: “костры горят – // “Очень хорошо” [4, с. 105]. Я. Янішчыц апісвае горад на Няве “ў рабінавых кастрах”. “Крывёй прасмолены” агонь памяці запалены ў гонар паэтаў:

Кастры ў вяках узыдуць зоркамі,
Хоць водбліск смутна лёг на скронь.
Ды на дваіх Айчыны горкі дым
І на дваіх – адзін Агонь! [4, с. 106].

Адметнымі з’яўляюцца і іншыя метафарычныя ўвасабленні агню: “агонь сугрэўны” [4, с. 162] здольны аб’ядноўваць людзей, садзейнічаць узаемаразуменню; “жар-птушка ў душы” [6, с. 69] вяскоўцаў-палешукоў – багаты ўнутраны свет, духоўная прыгажосць.

Паэтэса разумее агонь і як натхненне, творчасць, а таксама сведчанне пра незгасальнасць і бессмяротнасць памяці пра выдатных майстроў слова:

Але праз гвалт і кулі,
Палітыкаў мудрэй
Ідзе ў агонь-кашулі
Эрнэст Хемінгуэй [4, с. 82].

Дарэчы, лірычная гераіня прызнаецца каханаму: “Спалі мяне, як чарнавы лісточак, // Але й тады ўваскрэсну праз агонь” [4, с. 190]. У

кантэксце верша агонь найперш сімвалізуе вялікае і моцнае пачуццё, магчыма, і творчасць.

Аднак у некаторых вершах стыхія Агню знішчальная. Так, у творы “Жывы касцёр” са зборніка “Дзень вечаровы” расказваецца пра гістарычны факт спальвання кніг у “трывожным і гарачым” агні, іскры якога далятаюць да нашчадкаў:

А кніжкі ўсё ж вярталіся назад
І розуму і праўдзе нас вучылі,
І вернасці радзімай старане [3, с. 41].

У мастацкім свеце паэтэсы адлюстравана варожасць і адмоўнасць агню як жыццёвай небяспекі [12, с. 22], пакут і болю [13, с. 84], якія даводзіцца “збіваць... у вогненнай крыві” [6, с. 7]. А таксама сустракаюцца вобразы агню вайны, які забівае людзей [6, с. 22], атамнага агню, які пагражае Зямлі-Пампеі і Зямлі-Калысцы [4, с. 70]. І як дакор усім несправядлівым “вогненным войнам” [6, с. 17] паўстае вобраз безыменнага салдата-абаронцы, які дагэтуль “ідзе” з вайны: “Бо ўсё яшчэ, бо ўсё яшчэ // Планета пад агнём” [4, с. 10].

Супастаўленне розных агнёў, стваральнага і разбуральнага, знаходзім у вершы “Слова пра агонь”. Паэтэса заклікае ўсіх чытачоў: “Аддайце павагу агню, // Што хлебнаму духу спрыяе. // <…> // Забіце агонь вынішчальны! [4, с. 91].

Найбольш значны вобраз – “калінавы агонь” [6, с. 193], ён сімвалізуе жыццё, усё добрае і нядобрае, лёгкае і складанае, праз што павінен прайсці чалавек на сваім шляху, вышэйшым выпрабаваннем якога з’яўляецца каханне. Функцыя “калінавага агню” – ачышчэнне.

Сонца і зоркі адухаўляюцца ў творах Яўгеніі Янішчыц. “Сонца промень зыркі дасылае, // Каб спапяліць расстанняў крыгалом” [12, с. 120], – лічыць паэтэса. А зоркі ведаюць таямніцы чалавечай душы, ад іх залежыць лёс: “я гляджу на сузор’е: // Хацяб ні адна з яго зорак // Не ўпала і не разбілася // Дачасна” [12, с. 57].

У некаторых вершах апісваецца судакрананне сонца [5, с. 10] і зор [5, с. 57] з вадою. Анамарфоз стыхій Агню і Вады сімвалізуе абнаўленне, нараджэнне новага.

У цэлым для беларускай літаратуры характэрна абагаўленне святла. І гэта зусім невыпадкова: “Жыццё красуе, пакуль не схаладзееў агонь: зямны, нябесны, агульны, хатні агонь гарачай крыві і агонь думак, вольнай паходні агонь і кахання завязь” [14, с. 18], – зазначыла А. Хатэнка.

Агонь у творчасці Я. Янішчыц выступае як сімвал кахання, вясны, юнацтва, натхнення, творчасці, памяці, духоўнай прыгажосці. Ды разам з гэтым паэтэса добра ведае, што ёсць разбуральны агонь – вайна, забойствы,

душэўны боль, пакуты, небяспека. Галоўная задача чалавецтва, на яе думку, – абараніць жыццё, ствальны агонь і забараніць вынішчэнне, атамны агонь.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Бярозкін, Р. Праз першае лісце / Р. Бярозкін // У кн.: Бярозкін, Р. Паэзія – маё жыццё : Літаратурна-крытычныя артыкулы / Р. Бярозкін. – Мінск : Маст. літ., 1989. – С. 324 – 329.
2. Калядка, С. “Любоў мая, ты песня і маркота...” Лірыка Яўгеніі Янішчыц / С. Калядка // Роднае слова. – 1998. – № 4. – С. 36 – 47.
3. Янішчыц, Я. Дзень вечаровы / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1974. – 80 с.
4. Янішчыц, Я. Пара любові і жалю / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 223 с.
5. Янішчыц, Я. Снежныя грамніцы / Я. Янішчыц. – Мінск : Беларусь, 1970. – 64 с.
6. Янішчыц, Я. Каліна зімы / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 206 с.
7. Шамякіна, Т. Прырода і культура / Т. Шамякіна // Роднае слова. – 1996. – № 4. – С. 137 – 141.
8. Шамякіна, Т.І. Міфалогія і беларуская літаратура : нарысы і эсэ / Т.І. Шамякіна ; пасляслоўе І. Чароты. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 391 с.
9. Маковский, М.М. Удивительный мир слов и значений : Иллюзии и парадоксы в лексике и семантике / М.М. Маковский. – М. : Высш. школа, 1989. – 199 с.
10. Учение Живой Этики: в 3 т. – Т. 1 / Сост. Г.Е. Чирко. – СПб. : Отделение изд-ва “Просвещение”, 1993. – 586 с.
11. Фрэзер, Дж. Золотая ветвь / Дж. Фрэзер; пер. с англ. М.К. Рыкліна. – М. : Назрань: ООО “Фирма “Изд-во АСТ”, 1998. – 781 с.
12. Янішчыц, Я. Ясельда / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1978. – 128 с.
13. Янішчыц, Я. На беразе пляча / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 96 с.
14. Хатэнка, А. Зніч крыжовых дарог / А. Хатэнка. – Мінск : Полымя, 1992. – 116 с.